© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017



Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

МАСАВА-ПАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК

Газета Слонімская

№31 (269) 1 — 7 ЖНІЎНЯ 2002Г. НАКЛАД 11.000 ЭКЗ. КОШТ 250 РУБ.

«ГАЗЕТУ СЛОНІМСКУЮ» ЧЫТАЮЦЬ
Слонім, Зэльва, Дзятлава, Масты, Ваўкавыск, Шчучын, Ліда, Гродна, Баранавічы, іншыя гарады Беларусі, а таксама на HTTP://gs.promedia.by

Курсы обмена валют в г. Слониме по состоянию на 9[50] 30 июля 2002г.

	Покупка	Продажа
"Беларусбанк"		
1 USD	1820	1870
1 EURO	1830	1880
1 RUR	55	59
оао Белпромстройбанк	Покупка	Продажа
1 USD	. 1825	1850
1 EURO	1820	1865
1 ZL	430	460
1 RUR	56,5	58,7
"Белагропромбанк"	Покупка	Продажа
1 USD	1830	1850
1 EURO	1810	1840
1 RUR	56	58,5
Нацбанк РБ		
1 USD	1828	
1 EURO	1804,97	
1 RUR	58,09	

ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ!
На "Газету Слонімскую" можна падпісацца ў любым паштовым аддзяленні Беларусі з любога месяца. А жыхары Слоніма – і ў рэдакцыі нашай газеты.

ДАРАЖЭЕ ПРАЕЗД



Фота Віталя ГІЛЯ

З 1 жніўня ў Мінску праезд у гарадскім транспарце і ў метро будзе каштаваць 150 рублёў замест ранейшых 120-ці. У Слоніме пакуль плата за праезд у гарадскім транспарце застаецца ранейшай. Пра гэта карэспандэнту "ГС" паведамілі ў Слонімскім аўтапарку №3. Тым не менш, як паказвае практыка, усе новаўводзіны, у тым ліку і ў цэнаўтварэннях, хутка даходзяць і да беларускай правінцыі.

Лиц № 30 от 30.11.99г. до 30.11.04г. СГИК
ТЕХНИКА для ДОМА И ОФИСА
2-15-30 г. Слоним, ул Советская,8


Постоянно ОРГАНИЗОВЫВАЕМ ПОЕЗДКИ на автобусах «Форд-Транзит»
в г. Минск
Запись по тел. 2-22-99. 8-(0296)-551499 (автобус)
в г. Гродно 5-13-67.
Принимаем заявки по перевозке пассажиров по РБ. Подробная информация и запись по тел.
2-22-99, 8-(0296)-574024
Надёжно, комфортно, безопасно! Нам по пути...
Лиц №5-0384 МинТранс РБ до 30.08.2006

Откройте мир вместе с нами!
1. Организовываем ЭКСКУРСИИ по Беларуси, в Польшу, Литву на комфортабельных автобусах Volvo, (48+2) Mercedes (49+2) мест
Принимаем заявки от организаций, школ и населения.
2. Организовываем ПОЕЗДКИ в г.МОСКВА (Черкизовский рынок) каждый понедельник.
3. Осуществляем Международные перевозки туристических групп, шоп-туров, групп для отдыха в курортные зоны Украины, Болгарии, Чехии.
4-72-22, 8-0296-22-18-08
ТА "Гулливер"
Лиц. № 5-0288 27.04.2001г.-26.04.2006г. МТК

ВНИМАНИЕ ПОКУПАТЕЛЕЙ!
В магазине «Канцтовары», расположенном на **пл. Ленина, 8, с 1 августа** начинается широкая распродажа товаров для школьников. Здесь представлен большой ассортимент школьно-письменных принадлежностей как отечественных, так и зарубежных производителей.
Открыты дополнительно торговые точки **на рынке и в магазине «Юбилейный»**.
Выполняем заказы на оформление подарков для организаций города и района.
Ждём вас за покупками.
Тел. 2-45-41.

Организовываем поездки на а/м Форд-Транзит в ГРОДНО 15 мест.
Принимаем заявки по перевозке пассажиров по РБ.
Запись по тел.: 2-14-90 или 8-0296-78-09-72.
Лиц. № 5-0474, 15.07.02г.-14.07.04г. МТК РБ

Магазин "ВСЁ ДЛЯ СТРОЙКИ И РЕМОНТА"
расчет наличный, б/наличный, кредит в ОАО "Беларусбанке"
Мы работаем: понедельник-пятница с 9.00 до 19.00; суббота-воскресенье с 9.00 до 16.00. Ул. Первомайская, д.3, тел. 2-30-00.



Доп. к лиц. №2, 24.04.2002г.-30.11.2004г. СГИК

Всегда в продаже:
- клеевой раствор «Люкс» — 25 кг — 7300 руб., «Люкс плюс» — 25 кг — 11900 руб.;
- штукатурка «Люкс» — 25 кг — 3800 руб.;
- шпаклёвка «Люкс» —15 кг — 8300 руб.;
- фуги в ассортименте от 2200 руб.;
- обои импортные пр-во Германия и Украина от 2200 руб. (более 100 наименований

КОНДИЦИОНЕРЫ
2-15-30
Лиц. №30 от 30.11.99 до 30.11.04, СГИК

БЕЛГОССТРАХ
К сведению юридических и физических лиц
Представительство Белгосстраха по Слонимскому району проводит продажу полисов:
— зеленая карта – лицам, выезжающим в страны-участницы "Договора о зеленой карте" на автотранспортных средствах;
— пограничного страхования – нерезидентам (иностранным гражданам), эксплуатирующим транспортные средства на территории Республики Беларусь.
Договор страхования касается исключительно гражданской ответственности владельцев автотранспортных средств от ущербов, возникших в связи с движением этих средств на территории других государств, а во втором случае – на территории Республики Беларусь. При заключении договора страхования оплата в долларах США или белорусских рублях по курсу НБ РБ;
Более полную информацию вы можете получить у специалистов представительства.
Своевременно позаботьтесь о приобретении страховых полисов! Мы обеспечим надёжную защиту ваших материальных интересов.
Наш адрес: **г. Слоним, ул. В. Крайнего, д.17.**
Контактные телефоны: **2-45-97, 2-52-38.**



© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

НАВІНЫ

ПРОГНОЗИРУЕМ, ПЛАНИРУЕМ И ... НЕ ВЫПОЛНЯЕМ

На очередном заседании облисполкома Слонимский район выглядел бедным родственником, у которого ничего нет и ничего не получается.

На общем, областном, фоне роста социально-экономического развития, если верить докладу первого заместителя председателя облисполкома И. Данченко, состояние дел в Слониме выглядит не лучшим образом. Хозяйства Слонимского района снизили реализацию скота и птицы (но ведь президент запретил резать скот, **В. К.**), и не выполнили прогнозного (а кто этим прогнозам верит, **В. К.**) показателя по продаже скота и птицы государству. И по промышленному производству наш район, впрочем, как и Дятловский и Мостовский, не вышел даже на уровень прошлого года. То есть, промышленность, как таковая, "лежит", хотя и пытается работать.

И вот, в "черный" список предприятий, которые не выполняют прогнозы по Гродненской области, попали Слонимская камвольно-прядильная фабрика и Слонимский мясокомбинат.

Валерий КОВАЛЕНКО

АБЛВЫКАНКАМ УЗНАГАРОДЗІЎ

За бездакорную працу і добрасумленнае выкананне службовых абавязкаў граматай абласнога выканаўчага камітэта ўзнагароджана дырэктар Слонімскага гандлёвага камунальнага ўнітарнага прадпрыемства "Іса" Ірына Сяцько.

За шматгадовую добрасумленную працу, значны асабісты ўклад у навучанне і выхаванне падрастаючага пакалення такой жа ўзнагародай ушанавана начальнік упраўлення адукацыі Слонімскага райвыканкама Галіна Шмялёва.

Юрка КАРПАЧ

РЕПЛИКА

МУСОРНЫЙ ВЕТЕР В СЛОНИМСКОМ ПАРКЕ


Фота Вольгі ШЫНКЕВІЧ

Вот в таком "чистом" и "уютном" парке предлагается отдохнуть слонимчанам

Пока на Слонимском рынке проводится реконструкция, центр палаточной торговли переместился в городской парк. То, что в парке нашем порядка нет, это видно и понятно давно. Но такого бардака, как сейчас, там не было никогда.

Парк перестал быть местом отдыха. Да и какое удовольствие может быть у слонимчан и гостей, прохаживаясь среди вытоптанной травы и разбросанных по ней "отходов" дневной торговли? Похоже, парк ждет судьба городского пляжа, давно заброшенного и неухоженного.

Я не говорю уже о демонтаже каруселей-каруселей, о том, что молодежь забыла о летних дискотеках в парке, но поддерживать элементарный порядок все-таки можно!

Так можно было бы и временно разместить рынок на стоянке перед исполкомом, — тоже ведь центр города и места вполне хватило бы. И вид из исполкомовских окон был бы веселенький, и власть к народу была бы ближе. А так, с глаз долой — из сердца вон.

Парк – историческое место, как, впрочем, и синагога, и кладбище рядом с ней, укатанное под асфальт. И пора уже вернуть ему название парка действительно культуры и отдыха.

Валерий КОВАЛЕНКО

ЭКОНОМИКА

НАША ПРОМЫШЛЕННОСТЬ РАБОТАЕТ НА СКЛАД

По информации Министерства статистики и анализа, к 1 июля объем запасов готовой продукции на складах промышленных предприятий Беларуси достиг 77 процентов к среднемесячному объему производства.

Это самый высокий показатель в нынешнем году. В 2001 году максимальный объем запасов составлял 67,9 процента (на 1 июня и 1 июля), а на 1 января 2002 года — 63,8 процента.

В стоимостном выражении запасы готовой продукции выросли за июнь этого года с 1 трлн. 66,2 млрд. до 1 трлн. 113,7 млрд. рублей, или с 602 до 619 млн. долларов США в пересчете по официальному курсу. На 1 января стоимость запасов составляла 747,9 млрд. рублей, или 473 млн. долларов.

Не лучшая ситуация в этом плане и в Слонимском районе. По данным районного отдела статистики, сейчас на складах промышленных предприятий Слонимщины скопилось продукции на 7 миллиардов 403 миллиона рублей, что составляет 92 процента к среднемесячному объему производства. Для сравнения, на начало 2002 года цифры эти выглядели так: 5 миллиардов 29 миллионов — сумма стоимости товаров на складах, что составляло 52 % к среднемесячному объему производства. К сожалению, не ведется в Слониме статистика запасов продукции по отраслям промышленности. Но есть такие данные в целом по республике.

В легкой промышленности объем запасов готовой продукции достиг 140,5 процента к среднемесячному объему производства (135,5 млрд. рублей), в машиностроении и металлообработке — 131,1 процента (490 млрд.), в лесной, деревообрабатывающей и целлюлозно-бумажной промышленности — 93,8 процента (65,5 млрд.).

Дмитрий ВЛАСОВ, Валерий КОВАЛЕНКО

НАВІНЫ

БЕЗ ЖЫРОВІЦКАЙ ВАДЫ НІ ТУДЫ І НІ СЮДЫ

Мінскі завод безалкагольных напіткаў выпусціў першую партыю Мінска-Жыровіцкай пітной негазаванай вады — 10 тысяч дзвюхлітровых бутэлек.

Аб гэтым карэспандэнту "ГС" паведамілі ў аддзеле маркетынгу Мінскага завода безалкагольных напіткаў. Вада прыйшлася даспадобы пакупнікам, і яе імгненна раскупілі. У наступную суботу яна зноў паступіць у гандлёвыя кропкі Слоніма, Мінска і іншых гарадоў Беларусі.

Мінска-Жыровіцкая пітная негазаваная вада разліваецца па блаславенню Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта. Яна здабываецца з Мінскай артэзіянскай свідравіны на глыбіні 110 метраў. Да гэтай вады дабаўляецца і вада са свідравіны, якая знаходзіцца на тэрыторыі Жыровіцкага Свята –Успенскага манастыра. Дарэчы, частка даходаў ад гэтай вады пойдзе на патрэбы манастыра і Мінскай духоўнай семінарыі.

Сяргей ЧЫГРЫН


Фота Вольгі ШЫНКЕВІЧ

НОВОСТИ

УДОБНО И БЫСТРО

На днях у слонимчан появилась возможность поездки в Гродно и Минск на новом частном микроавтобусе "Форд-Транзит".

Эта комфортабельная машина рассчитана на перевозку 15 пассажиров.

По словам слонимчан, которые уже воспользовались услугами этого транспорта, дорога до Минска на новом "Форде" не кажется утомительной. "С нами – надежно, комфортно, безопасно!" – говорит индивидуальный предприниматель, который организовал пассажирские перевозки в столицу.

P.S. Запись по тел. 222-99; 8-0296-55-14-99.

Ольга ШИНКЕВИЧ


Фота Вольгі ШЫНКЕВІЧ

Отец Виктор освящает новый автобус

ЖАТВА-2002

ВОЕННЫЕ НА ПОЛЯХ РАЙОНА

Сегодня и слонимские военные оказывают посильную помощь хозяйствам района в уборке урожая.

Как сообщил корреспонденту "ГС" начальник оперативного штаба помощи в уборке урожая 11 механизированной бригады майор Бурак, бригада выделила колхозам 9 авторазведывательных станций (АРС), которые предназначены для своевременного выявления и помощи в ликвидации пожаров на полях. Для этих же целей в район отправлен сводный отряд из десяти военнослужащих, с ними находятся и три повара.

Кроме наблюдения за противопожарной ситуацией, слонимские военные оказывают непосредственную помощь в уборке зерновых. Четыре солдата на время жатвы стали помощниками комбайнеров. А два грузовых автомобиля "Урал" вывозят с полей колхоза "Мижевичи" урожай. И к понедельнику военная техника перевезла 240 тонн зерна.

Всего же 11 механизированная бригада помогает еще шести колхозам: имени Ленина, "Дружба", "Вперед", "Октябрь", совхозам "Победитель" и "Слонимский". По словам майора Бурака, работой военных руководители хозяйств довольны. Пока, правда, неизвестно, как будет производиться оплата за помощь военнослужащих.

Валерий КОВАЛЕНКО


Беларуская служба
Радыё Свабода
RADIO FREE EUROPE RADIO LIBERTY

Навіны зь Беларусі і сьвету, рэпартажы з рэгіёнаў, сталіцаў Эўропы, Амэрыкі, Азіі, правы чалавека, улада і апазыцыя, барацьба з тэрарызмам, агляды друку, эканоміка, культура, рэлігія, аналітыка, прагноз

Аўтарскія праграмы:

Нядзеля Праскі акцэнт, Вольная студыя, Вострая Брама, Інтэрнэт
Панядзелак Палітычная геаграфія, Сучасныя мэмуары
Аўторак Беларуская замежжа, Экспэртыза Свабоды
Серада Сучасныя мэмуары, Экспэртыза Свабоды
Чацьвер Палітычная геаграфія, Беларуская Атлянтыда
Пятніца Сучасныя мэмуары, Паштовая скрынка 111
Субота Сымбаль веры, Жывіце доўга, Сучасныя мэмуары, Галерэя Свабоды

Эфір: 18.00–24.00 і 06.00-08.00 на кароткіх і сярэдніх хвалях

Настройцеся на Свабоду!

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017


© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

Газета Слонімская
1 — 7 жніўня 2002г. №31 (269)

ПАМЯЦЬ І ЧАС

НЕЗАБЫЎНЫ МіГ ТРАГЕДЫІ

Амаль штодзённа з нашых тэлеэкранаў мы даведваемся пра катастрофы баявых, грузавых і пасажырскіх самалётаў і верталётаў. Здаецца, раней такіх трагедый у небе і на зямлі не было. Але катастрофы з крылатымі машынамі здараліся заўсёды. І яны будуць, мусіць, і надалей працягвацца да таго часу, пакуль будзе існаваць гэтая авіяцыйная тэхніка. Нават нягледзячы на самы высокі прагрэс у самалётабудаванні і камп'ютэрызацыі.



Мемарыяльны знак загінуўшаму лётчыку каля вёскі Талькаўшчына

Фота Вольгі ШЫНКЕВІЧ



Сяргей Крошын

Шаснаццаць гадоў назад авіякатастрофа баявога самалёта адбылася над Слонімшчынай. Толькі вопыт лётчыка дапамог адвесці МіГ-19 ад Слоніма і ад густанаселеных вёсак раёна.

Наогул, 1986 год для Шчучынскага разведпалка , якім камандаваў палкоўнік Віктар Лобаў, складваўся вельмі няўдачна. І гэтая няўдача пачалася з пятніцы, 10 студзеня. У вучэбна-разведвальны палёт на сваім самалёце МіГ-19 са Шчучынскага аэрадрома вылятае капітан Сяргей Крошын. У час палёту на самалёце здараецца паломка, пачынае адказваць рухавік, і машына не падпарадкоўваецца вопытнаму лётчыку. Усё, што ён паспеў зрабіць, дык гэта не дапусціць, каб баявая машына пры падзенні на зямлю пакінула пасля сябе чалавечыя ахвяры. Сяргей Крошын дзейнічаў вельмі хутка і беспамылкова. Найперш, яму ўдалося зліць на зямлю некалькі тон гаручага (запраўка аднаго самалёта МіГ-19 складае 14.000 кг керасіну), каб пры падзенні не адбылося страшнага ўзрыву і пажару. І, вядома, адвесці самалёт далей ад чалавечага жылля. Але пры падзенні самалёт усё ж знёс некалькі дахаў у дамах жыхароў вёскі Талькаўшчына. З мясцовых жыхароў ад катастрофы ніхто не пацярпеў, але загінуў лётчык Сяргей Крошын. Яму было ўсяго 27 гадоў, ён меў ордэн за службу ў Афганістане, быў выдатным спартсменам.

Нядаўна мы наведалі вёску Талькаўшчына і пагутарылі з мясцовымі жыхарамі, якія былі сведкамі той страшнай катастрофы. Найбольш ад падзення самалёта пацярпела хата Уладзіміра Феакцістава. Вось што ён нам расказаў:

— Самалёт упаў недалёка ад маёй хаты, але лётчыка адкінула на некалькі дзесяткаў метраў. Дах дома быў пашкоджаны ад узрыву самалёта, нават правалілася столь. Хваставая частка машыны ляжала ў маім агародзе. Калі пачалі збіраць рэшткі самалёта, то сабралі цэлы КАМАЗ. Пасля гэтай трагедыі падлічылі нанесены маёй сям'і ўрон і аплацілі. Гэтай справай займаўся генерал з Мінска. Да сённяшняга дня да ваенных лётчыкаў у мяне прэтэнзій няма.

Дарэчы, сам лётчык ваяваў у Афганістане, па ім двойчы стралялі афганцы. Там застаўся жыць, а тут вось загінуў. Жонка з дачкою амаль штогод прыязджаюць у нашу вёску, наведваюць мемарыяльны знак, які знаходзіцца за Талькаўшчынай. Лётчык быў родам з Расіі, а жонка — са Шчучына.

Марыя Вікенцьеўна Барысік разам з пляменніцай знаходзілася ў сваёй хаце, калі самалёт пры падзенні крылом зачапіў дах яе дома. Аб гэтым нам паведаміла яе дачка Наталля. А яшчэ Наталля Барысік паказала нам фотаздымкі сваёй хаты пасля катастрофы самалёта.

У гэты студзеньскі дзень 1986 года ад падзення самалёта ў Талькаўшчыне пацярпелі не толькі дамы вяскоўцаў, было пашкоджана і шмат дрэў. Але самае галоўнае, што засталіся жывыя людзі.

За Талькаўшчынай на лясным пагорку яшчэ здалёк віднеецца мемарыяльны знак памяці пілота. На ім напісана: " Лётчику Сергею Крошину от боевых товарищей. 17.08.1986г.". Знак абгароджаны, але нейкія вандалы, інакш іх і не назавеш, сарвалі і ўкралі дзверы ад агароджы, а таксама кавалак ланцуга. Невядома, ці прыязджалі сёлета ў Талькаўшчыну жонка з дачкою лётчыка, ды і калі прыедуць, то што яны змогуць падумаць, гледзячы на гэты помнік, да якога прыклаліся рукі нядобразычліўца.

Сяргей ЧЫГРЫН



Фота Вольгі ШЫНКЕВІЧ

Наталля Барысік расказвае пра студзеньскія падзеі 1986 года



Так выглядаў дом Уладзіміра Феакцістава ў Талькаўшчыне пасля катастрофы самалёта

ЗДАРЭННІ

З ЛІТВЫ ПРЫЕХАЛА, КАБ КРАСЦІ

Днямі супрацоўнікі слонімскай міліцыі затрымалі на міні-рынку, які знаходзіцца на вуліцы Брэсцкай, цыганку. Яна спрабавала ўкрасці грошы ў жанчыны, што прыйшла на рынак за пакупкамі.

Спроба аказалася няўдалай. Як высветлілася пазней, у Слонім на промысел цыганка прыехала аж з Літвы, дзе пастаянна пражывае.

"ПАГУТАРЫЎ" ДА СМЕРЦІ

Жыхар Альбярціна С., які пражывае па вуліцы 1-й Сямігодкі, вырашыў "разабрацца" са сваёй жонкай.

Гутарка не атрымалася. Тады С. жорстка збіў сваю другую палову. Ад нанесеных траўмаў жанчына памерла.

МАГНІТОЛЫ КАРЫСТАЮЦЦА ПОПЫТАМ

На мінулым тыдні былі зарэгістраваны два крадзяжы аўтамагнітол з прыватных машын.

Адзін крадзеж адбыўся ў вёсцы Дзераўная, а другі — у Слоніме на вуліцы Тапалёвай. Прычым у абодвух выпадках злодзеі ўпадабалі магнітолы маркі "Гродна-302".

Міліцыя вядзе пошук.

ЛЮДЗІ ПАКРЫХУ ЗНАХОДЗЯЦЦА

За апошні тыдзень знайшліся чатыры слонімцы, якіх адшуквалі родныя.

Усе "зніклыя" жывыя і здаровыя вярнуліся дамоў.

Валерый КАВАЛЕНКА

ПРОИСШЕСТВИЕ

ГОРЯТ ИНОМАРКИ

В прошлый вторник на улице Минский тракт загорелся автомобиль «Ауди-80».

По предварительным данным причиной пожара стало нарушение техники безопасности во время сварочных работ. Иномарка сгорела полностью.

А двумя днями позже, в четверг, на Брестской улице из-за замыкания электропроводки воспламенился автомобиль «Форд».

Огнем был поврежден капот машины.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ВЫПАДАК

ЧАРАПАХА ТРАПІЛА НА КРУЧОК

Адзін з вайскоўцаў Слонімскай механізаванай брыгады ў выхадны дзень вырашыў з вудаю пасядзець на беразе Салдацкага возера, што на Энцы.

Закінуўшы вуду, ён стаў чакаць, калі рыбіна трапіць на кручок. Якім было здзіўленне аматара-рыбака, калі замест карпа ці карася ён выцягнуў чарапаху. Так-так, звычайную балотную чарапаху. Улоў ён прынёс дамоў, каб паказаць дзецям, суседзям і саслужыўцам. А праз некалькі дзён адпусціў чарапаху ў возера. Як паведамляе Беларуская энцыклапедыя, балотныя чарапахі ў Беларусі трапляюцца ў басейне Дняпра, Прыпяці, Шчары і на поўдні Белавежскай пушчы. Даўжыня іх дасягае да 25 см.Чарапахі добра пераносяць няволю, жывуць да 300 гадоў.

Сяргей ЧЫГРЫН

АРМЕЙСКИЕ НОВОСТИ

СЕГОДНЯ УЖЕ ЕСТЬ ВЫБОР, КОГО ПРИЗВАТЬ В АРМИЮ

В летний призыв в 11 механизированную бригаду пришло 312 молодых воинов. По словам офицера отделения воспитательной работы бригады майора Николая Гарматного, по сравнению с другими призывами качественная характеристика нынешней молодежи заметно лучше.

— Сейчас, — отмечает майор Гарматный, — уже и в военкоматах есть из чего выбирать, а не "грести" в армию всех под одну гребенку.

Что же собой представляет молодое пополнение бригады? Если брать уровень образования, то с высшим образованием в армию пришли 22 призывника; с неполным высшим — двое; с техническим — 56. Сто шестьдесят девять закончили СПТУ, среднее образование у тридцати восьми призывников, и лишь 13 имеют неполное среднее образование.

Пятьдесят два молодых воина до призыва работали на государственных предприятиях, 10 — в коммерческих организациях, 58 — в сельском хозяйстве, 8 — занимались частным бизнесом. Большинство же (141) учились и находились на иждивении родителей. Приводов в милицию не имел ни один из призывников 11 механизированной бригады. Шестеро женаты и четверо уже имеют своих детей.

79 призывников воспитывались в многодетных (три и более детей) семьях, 55 — в неполных семьях, пятеро призывников росли без родителей.

Вот такое социальное положение солдат, пришедших служить этим летом в 11 механизированную бригаду. Призывались же парни из Слонима, Дятлово, Островца, Свислочи, Волковыска, Зельвы, Гомеля и Могилева.

В следующее воскресенье, 4 августа, они торжественно примут воинскую присягу. После этого около 130 солдат отправятся в учебные подразделения, чтобы через полгода вернуться в Слоним специалистами нового для себя, военного, дела.

Валерий КОВАЛЕНКО

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

ГРОДНА

МАЛАДЗЁЖНАЯ АЛІМПІЯДА-2002

10-17 жніўня ў Гродне адбудзецца традыцыйная Маладзёжная Алімпіяда. Сёлета арганізатарам Алімпіяды выступіла мясцовая маладзёжная ініцыятыва «Ліс».

Адкрыццё Алімпіяды адбудзецца 10 жніўня а 14.00 ля Каложы. У праграме мерапрыемства запланаваныя спаборніцтвы па футзалу, валейболу, малюнках, бардаўскіх спевах, «Міс Беларусачка-2002», падкідному дурню, шахматах, а таксама эстафета і піўны спабор (праўда, арганізатары не выключаюць магчымых змен). Пераможцаў у розных намінацыях чакаюць ганаровыя ўзнагароды.

Заяўку на ўдзел можна будзе запоўніць падчас адкрыцця Алімпіяды. Па папярэдніх дадзеных, гэткі намер ужо выказалі прадстаўнікі каля 10 гродзенскіх маладзёжных арганізацый.

Валера РУСЕЛІК

СТВОРАНАЯ КААРДЫНАЦЫЙНАЯ РАДА

Па ініцыятыве Гродзенскага грамадскага аб'яднання «Клуб прадпрымальнікаў» была створаная Каардынацыйная Рада стратэгіі ўстойлівага развіцця Гродзенскай вобласці.

Выканаўчым дырэктарам Рады абралі Франца Аўдзея.

Як паведаміў Франц Мамуль, «стварэнне гэтай Рады патрэбнае дзеля таго, каб нашыя дзеці маглі спакойна жыць, а не існаваць. Нацыянальная стратэгія ўстойлівага развіцця прадугледжвае вызначэнне шляхоў развіцця краіны да 2020-га года. Сюды закладаюцца пытанні жыццядзейнасці, звязаныя з экалогіяй, прадпрымальніцтвам і іншымі сферамі жыцця. Мы зацікаўленыя ў тым, каб у гэтай стратэгіі былі прадстаўленыя пытанні прадпрымальнікаў.»

Каардынаты Каардынацыйнай Рады стратэгіі ўстойлівага развіцця Гродзенскай вобласці: 230023, Гродна, вул. Акадэмічная, 15; тэл./факс: (+0152) 44-64-80.

Андрэй МЯЛЕШКА

ДЗЯРЭЧЫН

"БОЖАЯ РАДАСЦЬ" СКОНЧЫЛАСЯ

— Я хачу расказаць пра вядомы дзіцячы лагер "Божая радасць", — гаворыць маці адной з выхаванак гэтага лагера Ірына З. — Лагер знаходзіўся ў вёсцы Дзярэчын Зэльвенскага раёна. Праз вёску праходзіць цэнтральная дарога на Гродна, і ўсе, хто тут праязджае, могуць бачыць з аднаго боку дарогі царкву, а з другога касцёл. Настаяцель касцёла Юзэф Файлер прыехаў у Дзярэчын з Германіі і ўжо восем гадоў правіць службу. Ён арганізаваў для дзетак са Слоніма, Зэльвы, Мастоў і іншых гарадоў і вёсак Гродзеншчыны летні лагер "Божая радасць". Прычым, за адпачынак дзіцяці ў лагеры бацькам не патрэбна было плаціць грошы. У гэтым лагеры адпачывалі мая дачка і пляменніца, і я хачу сказаць, што сюды з задавальненнем ехалі дзеці з багатых і з бедных сем'яў. І да ўсіх іх былі аднолькава добрыя адносіны з боку айца Юзэфа і сясцёр. Усім дзецям удзялялася вялікая ўвага. За змену яны вывучвалі шмат песень, вучыліся танчыць кракавяк, ездзілі на экскурсіі, адпачывалі на возеры. Па вечарах з лагера чуліся песні, і мясцовыя бабулі і дзяды выходзілі вечарам на лавачкі, каб паслухаць дзіцячыя спевы. Ціхая вёска ў гэты час ажывала.



Дзеці і выхавацелі лагера, якога больш не існуе

Дзеці былі занятыя справай, накормлены і дагледжаны, а бацькам гэта не каштавала ні капейчыны... І вось "Божую радасць" закрылі. Прыехала з Зэльвы камісія, паглядзела, знайшла недахопы, і з 24 ліпеня лагера больш не існуе. Падставай для закрыцця сталі непадпісаныя сталы і ракавіны на кухні школы, дзе дзецям рыхтавалі ежу. Не спадабалася камісіі і тое, што падлеткі часам дапамагалі дарослым на кухні і ў агародзе. Асабліва настойваў на закрыцці галоўны ўрач Зэльвенскай санэпідэмстанцыі Анатоль Фёдараў. Так вось узялі і закрылі цудоўны лагер. А ці нельга было выправіць тыя недахопы? Няўжо цяжка падпісаць той кухонны інвентар?.. Мы цяпер жывём у такі час, што далёка не ў кожнай сям'і ёсць магчымасць паехаць некуды ў адпачынак ці нават купіць пуцёўку свайму дзіцяці. А тут побач была такая магчымасць бясплатнага адпачынку для дзяцей, то і яе патрэбна было адабраць!" — з горыччу закончыла Ірына.

Карэспандэнт "ГС" звязаўся па тэлефоне з галоўным урачом Зэльвенскай санэпідэмстанцыі, які паведаміў, што ён са свайго боку пастанову аб закрыцці лагера не выносіў. Лагер закрылі па рашэнню мясцовага райвыканкама 24 ліпеня, пасля таго, як там скончылася другая змена.

Такім чынам, "Божая радасць", дзякуючы "ласцы" мясцовых уладаў, праіснавала нядоўга — з 18 чэрвеня па 24 ліпеня.

Мікола КАНАНОВІЧ

ЗЭЛЬВА

БАБУЛЯ ПАКОНЧЫЛА З САБОЙ

Жыхарка вёскі Агатова скончыла жыццё самагубствам.

72-гадовая жанчына павесілася ў хляве каля свайго дома. Аб гэтым карэспандэнту "ГС" паведамілі ў Зэльвенскай раённай пракуратуры.

Наталля ГЛУШЭНЯ

УПАЎ З ПЯТАГА ПАВЕРХА

Зэльвенец, які жыў на вуліцы Пушкіна, упаў з пятага паверха. Праз два дні мужчына памёр ад атрыманых раненняў.

Ці было гэта актам самазабойства, ці няшчасным выпадкам, застаецца невядомым.

Наталля ГЛУШЭНЯ

ДЗЯТЛАВА

ШЛЮБ ПРАЗ 50 ГАДОЎ

Сямейная пара Іванашкаў з Дзятлава нядаўна адзначыла 50-гадовы юбілей сумеснага жыцця.

У свой урачысты дзень яны бралі шлюб у мясцовай царкве, бо па розных жыццёвых прычынах раней гэта зрабіць не змаглі. Для "маладых" у гэты дзень былі і традыцыйная брама, і кветкі, і падарункі ад дзяцей, унукаў і праўнукаў.

КАРОВЫ Ў АГАРОДАХ

Дзятлаўскія гаспадыні, агароды якіх знаходзяцца недалёка ад аўтастанцыі, убачылі, што па іхніх градах патапталіся каровы мясцовага калгаса "Ніва".

Статак пасвіўся недалёка на іржышчы, а пасля хлынуў на агароды. Дзятлаўчане пагражаюць калгасу судом, бо гэта ўжо не першы падобны выпадак.

ХАДЗІЦЬ У МУЗЕЙ СТАЛА ДОРАГА

Супрацоўнікі Дзятлаўскага гісторыка-краязнаўчага музея занепакоены зацішшам наведвальнікаў, бо цяпер хадзіць у музей людзям стала дорага.

Калі раней дзіцячы білет каштаваў 60 рублёў, то цяпер — 500, а для дарослых квіток стаў каштаваць ажно 1500 рублёў. Не ад добрага жыцця пайшлі на такі крок супрацоўнікі музея. Да канца года яны павінны сабраць два мільёны рублёў. Зрабіць гэта ім будзе не так проста. Бо ў наведвальнікаў, якія заходзяць у музей і даведваюцца пра кошт білета, адразу знікае жаданне знаёміцца з экспанатамі, і яны проста пакідаюць будынак.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

СТРАТА

ЁН ВЕРЫЎ У СІЛУ МАСТАЦТВА

Трагічна абарвалася жыццё нашага земляка, заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь Баляслава Сяўко.

Гэта здарылася 5 чэрвеня. Артыст Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Якуба Коласа ў Віцебску Баляслаў Сяўко не з'явіўся на працу. На дачы яго таксама не аказалася. Віцебская міліцыя пачала пошукі артыста толькі праз тыдзень. З дапамогаю вайскоўцаў быў прачэсаны лес каля дачы Баляслава Сяўко, а таксама бліжэйшы ўчастак Заходняй Дзвіны. Але знайсці артыста не ўдалося. І толькі нядаўна цела нашага земляка было выяўлена ў калодзежы недалёка ад уласнай дачы.

Некаторыя лічаць, што артыст паконччыў жыццё самагубствам з-за таго, што яму не далі звання народнага артыста. Але яго калегі аспрэчваюць такія чуткі. Баляслаў Іванавіч быў адным з вядучых акцёраў тэатра, меў шмат роляў, быў узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны.

Мне пашчаслівілася з ім сябраваць, хоць быў ён намнога старэйшы за мяне. Бачыліся мы рэдка, бо ён жыў у Віцебску, але не забывалі адзін аднаму пазваніць ці напісаць ліст, паштоўку. Я некалькі разоў пісаў пра яго і ягоную тэатральную творчасць артыкулы, друкаваў іх у рэспубліканскай прэсе.

Баляслаў Сяўко

Баляслаў Сяўко нарадзіўся ў вёсцы Міжэрычы Зэльвенскага раёна ў 1940 годзе. Пасля заканчэння мясцовай дзесяцігодкі паступіў у Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. Вучыўся ў педагога Дзмітрыя Арлова. Пасля атрымання дыплома ён і параіў Баляславу Іванавічу ісці працаваць у Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа, якому артыст аддаў 37 гадоў сваёй нялёгкай прафесіі акцёра. "Прафесія акцёра, — казаў мне некалі Баляслаў Іванавіч, — самая залежная. Залежыш ад драматурга: чакаеш, каб ён напісаў для цябе. Чакаеш ад рэжысёра, каб ён даў магчымасць сыграць ролю, якая табе спадабалася, і г.д.".

Баляслаў Сяўко сыграў дзесяткі роляў у тэатры і ў кіно. Яму даспадобы былі драматычныя і характарныя ролі. Ён здымаўся ў кінафільмах "Малады дубок" (роля Максіма), шматсерыйным тэлефільме "Дзяржаўная граніца" (роля паляка Стопіньскага) і ў іншых.

У вольны ад тэатра і кіно час Баляслаў Іванавіч спяшаўся ў другі свой тэатр пантамімы "Мім", які ён арганізаваў сярод глухіх дзяцей у Віцебску яшчэ ў 1969 годзе. Тэатру было прысвоена званне народнага. У сваім рэпертуары "Мім" налічваў больш за сто пастановак, аўтарам якіх з'яўляўся сам кіраўнік.

А яшчэ наш зямляк захапляўся выбабамі з дрэва.У яго калекцыі іх сабралася шмат. У іх акамулявалася шчодрасць і дабрыня душы самога акцёра, акцёра, які моцна любіў людзей, тэатр, кіно і ўсё прыгожае, што акружала гэтага таленавітага чалавека.

Сяргей ЧЫГРЫН

ВОЛКОВЫСК

ЭКОНОМИКА ХРОМАЕТ

На предприятии "Беллакт" состоялось расширенное заседание коллегии управления экономики. Итоги работы промышленных предприятий и транспортных организаций района за первое полугодие подвел заместитель начальника управления экономики райисполкома Николай Цалко.

Прогнозные показатели выполнили 10 предприятий из шестнадцати. Не обеспечили среднегодовой темп роста по выпуску продукции "Волковыскстройматериалы", консервный завод, хлебозавод, заводы КСОМ и комбикормовый. Несмотря на то, что производственные показатели выполнены, промышленность района остается пока убыточной.

Александр ДАНИЛИН

УЧАСТНИК ФЕСТИВАЛЯ

На проходившем недавно "Славянском базаре" в Витебске Волковыск представлял театр моды "Спадчына".

По сообщению заместителя заведующего отделом культуры райисполкома Зои Бойко, официальное приглашение на участие в этом престижном фестивале коллектив Дома творчества получил в апреле этого года после удачного выступления на отчетном концерте Гродненской области в Минске.

Участницы "Спадчыны" продемонстрировали на "Славянском базаре" прекрасные костюмы, изготовленные собственными руками. Со словами благодарности и признания к ним обратились Олег Окулич, Ядвига Поплавская, ансамбль "Песняры".

Александр ДАНИЛИН

ОСТАЛИСЬ БЕЗ ЗАРПЛАТЫ

В дежурную часть Волковысского РОВД поступило заявление от заведующей магазина "ВИТА" ОАО "Беллакт" о том, что из ее рабочего кабинета совершена кража денег в сумме 573 200 рублей.

Деньги пропали из сумочки продавца Р., которая, согласно договора, получила их для выдачи зарплаты работникам магазина.

Александр ДАНИЛИН

ТРАГЕДИЯ В РОСИ

Женщина, водитель автомобиля "KIA", двигавшегося по улице Зеленой в г. п. Рось, не справилась с управлением. Автомобиль съехал в кювет, и водитель была выброшена через лобовое стекло.

От полученных травм женщина скончалась на месте происшествия.

Александр ДАНИЛИН

КАЗУС НА ДОРОГЕ

В Волковыске по улице имени Желудева в районе АЗС-1 медленно двигалась повозка. Неожиданно лошадь, испугавшись проезжавшего рядом автомобиля, "понесла" и порвала упряжь.

Телега, двигаясь дальше по инерции, врезалась в автомобиль "Рено-19". Машина получила технические повреждения, а возница отделался лёгким испугом.

Александр ДАНИЛИН

СЛОНІМ

П'ЯНЫЯ ЗА РУЛЁМ

За мінулы тыдзень супрацоўнікамі ДАІ былі затрыманы ў Слоніме і раёне 43 чалавекі, якія кіравалі аўтамабілямі і трактарамі ў нецвярозым стане.

Сярод затрыманых — 13 п'яных работнікаў з сельскіх гаспадарак раёна. Усе затрыманыя атрымаюць адміністрацыйныя спагнанні. Аб гэтым карэспандэнту "ГС" паведамілі ў Слонімскім аддзяленні ДАІ.

Сяргей ЧЫГРЫН

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

БАРАНОВИЧИ

ПУШНИНА И ЛЕТОМ В ЦЕНЕ

В 31 миллион рублей оценивается ущерб, нанесенный неизвестными Барановичскому зверохозяйству.

Как сообщили БелаПАН в пресс-службе УВД Брестского облисполкома, 22 июля в милицию обратился главный экономист этого хозяйства. Он сообщил, что в период времени с 18 по 22 июля неизвестные проломили крышу, разобрали дымоход и вынесли из помещения 819 шкурок норки и 85 шкурок чернобурой лисы.

Поскольку предприятие охраняется, а помещение, где находились шкурки, подключено к сигнализации, есть подозрения, что к краже причастны должностные лица. Расследование данного случая проводится отделом по борьбе с экономической преступностью УВД. Возбуждено уголовное дело.

Валентина КОЗЛОВИЧ

МЕЖДУНАРОДНАЯ ЛЕТНЯЯ ШКОЛА ДЛЯ СТУДЕНТОВ

В Барановичах работала Международная летняя школа для студентов-юристов "Право на каждый день — 2002".

Мероприятие организовано гродненским областным общественным объединением молодых ученых "ВИТ" совместно с Программой развития ООН в Беларуси. В работе летней школы участвовали студенты из Беларуси, Польши, России и Украины. Среди основных направлений работы — обмен опытом будущих юристов и разработка информационных материалов для детей и молодежи по реализации своих прав в сложных жизненных ситуациях.

БелаПАН

ЩУЧИН

ДВОЕ ДЕТЕЙ ПОГИБЛИ В РЕЗУЛЬТАТЕ ПОЖАРА

Возникший сегодня утром в четырехэтажном жилом доме Щучина пожар стал причиной гибели двоих детей, получивших смертельную дозу угарного газа.

Около 8 часов утра в квартире на четвертом этаже одного их жилых домов возникло сильное задымление. В столь раннее время дома оставались только двое детей — 5-летний Алексей и 4-летний Евгений, родители который находились на работе. Взрослые отсутствовали около часа, однако этого времени хватило, чтобы дети с помощью спичек развели огонь.

К прибытию спасателей в квартире возникло сильное задымление, в одной из комнат горел шкаф. Спасателям пришлось выбить закрытую входную дверь. Войдя в квартиру, работники МЧС в течение нескольких минут ликвидировали пожар и нашли детей. Оба ребенка находились без признаков жизни. Тем не менее, детей доставили в больницу Щучина, однако уже там медики констатировали их смерть.

БелаПАН

МАСТЫ

КАМПУТАРАЎ ПАБОЛЬШАЛА

У Мастах амаль адначасова адчыніліся два салоны "Камп'ютарныя гульні".

Адзін – прыватны, размясціўся ў спартыўнай зале СШ № 2, другі належыць супрацоўнікам аддзялення фронту "Дзецям Чарнобыля" і знаходзіцца ў будынку разам з раённым аддзелам статыстыкі.

Антон МАКЕЙ

БЕРЕСТОВИЦА

РАЙИСПОЛКОМ РЕШИЛ СНЕСТИ ЦЕРКОВЬ...

Берестовицкий райисполком принял решение о сносе "самовольно возведенной постройки Спасюком И.Г." — дома и домовой церкви управляющего незарегистрированной Белорусской автокефальной церкви Яна Спасюка.

Как сказано в документе, "заслушав и обсудив информацию Гончаровой Г.Г. — заместителя председателя исполкома, председателя комиссии за ходом выполнения решения исполкома от 10.06.2002 года №196 "О приостановлении строительства дома Спасюка И.Г.", (...) Берестовицкий районный исполнительный комитет отмечает, что гражданин Спасюк И.Г. не выполняет указанное решение и продолжает самовольное строительство, осуществляя его без получения соответствующего разрешения Берестовицкого райисполкома; без согласованной в отделе территориальной планировки, градостроительства и архитектуры в полном объеме проектной документации. (...) На основании вышеизложенного (...) Берестовицкий райисполком решил: гражданину Спасюку И.Г. самовольно возведенную постройку до 25.07.2002 года снести за собственные средства. В случае невыполнения данного решения ОАО "Берестовицкая ПМК-141" с 25.07.2002 года начнет работы по сносу самовольно возведенной постройки за счет средств застройщика Спасюка И.Г.».

В интервью БелаПАН Ян Спасюк заявил, что все необходимые документы и разрешения были получены. "Однако когда власти узнали о строящейся церкви, началась настоящая кампания запугивания строителей и водителей, подвозивших стройматериалы. Их вызывали в различные организации и угрожали увольнением. Нескольких строителей сотрудники милиции задержали на стройплощадке якобы за употребление спиртного, однако выяснилось, что строители были трезвы. На стройплощадке неоднократно отключалась электроэнергия", — сообщил Ян Спасюк. Сам управляющий незарегистрированной Белорусской православной автокефальной церкви был вызван в налоговую инспекцию, где от него потребовали декларацию о доходах. Несмотря на все препятствия, здание площадью 400 квадратных метров было достроено. 2 августа должно было состояться освящение церкви, однако районные власти постановили ее снести.

"Власти увидели, что появилась угроза православной церкви Московского патриархата, которая теряет свою популярность, и решили не допустить строительства даже одного храма Белорусской православной автокефальной церкви на территории Беларуси. Они пошли по пути коммунистов, разрушавших храмы, убивавших священников или ссылавших их на Соловки", — утверждает Ян Спасюк.

Он намерен обратиться за поддержкой к международной общественности и правозащитным организациям.

БелаПАН

...А ЛЮДЗІ АБАРАНЯЮЦЬ СВЯТЫНЮ БЕЛАРУСКАЙ АЎТАКЕФАЛЬНАЙ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ



І вось 26 ліпеня ўлады распачалі сваю крамольную акцыю. Амаль адразу пасля таго, як бераставіцкая міліцыя затрымала каля недабудаванага храма Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царвы, што ў пасёлку Пагранічны, журналістаў Андрэя Пачобута і Валерыя Шчукіна, да царквы пад'ехалі два краны і пнеўмакампрэсар з адбойным малатком. Завяршаў гэтую ўнушальную працэсію аўтобус з рабочымі. Было вельмі шмат міліцыянэраў, амапаўцаў, у тым ліку з Гродна. Прысутнічалі таксама кагэбісты з відэакамерай. Абаронцы царквы, у асноўным моладзь, стаялі наверсе будынка, двое з іх – сябры незарэгістраванай канфедэрацыі дзеючых суполак "РАЗАМ" – Дзмітрый Раманоўскі і Мікіта Паўроз прыкавалі сябе ўнутры царквы да калонаў. Мясцовыя бабулькі – прыхажанкі селі па перыметру будынка і спявалі малітвы.

Падрыхтоўкай да знішчэння царквы кіраваў намеснік старшыні Бераставіцкага райвыканкама Пётр Дудзько і намеснік старшыні Бераставіцкага райвыканкама па будаўніцтву Галіна Ганчарова. Калі рабочыя пад'ехалі і ўбачылі, што будынак, які трэба разбураць, гэта царква, то яны адмовіліся выконваць загады начальства. Параіўшыся між сабой, рабочыя пашыбавалі пешшу ў бок Вялікай Бераставіцы. Адзін з іх застаўся, аднак, запусціўшы кампрэсар, неўзабаве таксама адышоў.

Пётр Дудзько паехаў у райцэнтр, адкуль прывёз яшчэ трох рабочых. Аднак і яны, убачыўшы людзей, якія абаранялі царкву, адмовіліся ад работы. Пасля гэтага спачатку Дудзько, затым Ганчарова, а потым і міліцыя па чарзе пакінулі "поле бітвы". Услед ім бабулькі – прыхажанкі пасылалі чырвоныя знаменні – маўляў, едзьце з Богам. Так закончыўся чарговы дзень супрацьстаяння прэзідэнцкай "вертыкалі" і незарэгістраванай абшчыны Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царвы.

Адразу пасля інцыдэнту айцом Янам Спасюком, настаяцелем будуючагася храма, у Гарадзенскія аблвыканкам і пракуратуру былі пададзеныя скаргі на рашэнне Бераставіцкага райвыканкама аб зносе царкоўнага будынка. Айцец Ян заявіў, што нягледзячы на перашкоды, царква адкрыецца ў належны тэрмін. Калі для гэтага спатрэбіцца працаваць па начах, то прыхажане – мясцовыя жыхары – будуць працаваць і ўначы, падкрэсліў у размове з карэспандэнтам інтэрнэт-газеты "ПАГОНЯ" айцец Ян Спасюк.

А ў нядзелю, 28 ліпеня, супрацоўнікамі Бераставіцкага РАУС узялі ў аблогу будынак храма. Міліцыянты ўварваліся на тэрыторыю царквы, выкарыстаўшы замяшанне, якое ўзнікла ў абаронцаў царквы пасля таго, як настаяцель храма айцец Ян Спасюк страціў прытомнасць падчас перагавораў з прадстаўнікамі мясцовай ўлады.

Нагадаем, што супрацьстаянне паміж вернікамі і мясцовай «вертыкаллю» ўзнікла пасля таго, як Бераставіцкі райвыканкам прыняў рашэнне аб разбурэнні першага на тэрыторыі Беларусі храма Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы. Спроба разбурыць будынак, якая адбылася 26 ліпеня, была няўдалай. Рабочыя Бераставіцкага МПМК – 41 адмовіліся руйнаваць святыню. Гэтая няўдача выклікала павелічэнне агрэсіі ўладных структураў 3 адпачынку тэрмінова быў выкліканы старшыня Бераставіцкага райвыканкама Іван Захарчук. Па словах айца Яна, менавіта Іван Захарчук асабіста кіруе аперацыяй па знішчэнні "няправільнай" царквы. Адным з першых крокаў улады стала поўная блакіроўка ўсіх уездаў і выездаў з пасёлка Пагранічны, які знаходзіцца літаральна на мяжы з Польшчай.

Стан айца Яна Спасюка выклікае занепакоенасць. Цягам дня да яго двойчы выклікалі хуткую дапамогу. Апошні раз, у сувязі з гіпертанічным крызам, дактары прапанавалі хвораму святару шпіталізацыю. Аднак, зважаючы на падзеі, якія адбываюцца вакол царквы, айцец Ян адмовіўся легчы ў бальніцу.

На дадзены момант царква па-ранейшаму знаходзіцца ў аблозе.

Андрэй АДЛЯНІЦКІ, www.pahoniapromedia.by

МАСТЫ

НОВЫ ПЕРШЫ

Урэшце прызначаны першы намеснік старшыні райвыканкама, начальнік райаграпрамхарчу раёна. Ім стаў Мікалай Альговіч.

Як сцвярджаюць дасведчаныя супрацоўнікі райвыканкама, Мікалай Сяргеевіч у свой час быў аднакурснікам цяперашняга старшыні райвыканкама Аляксандра Кісялёва, затым некалькі гадоў працаваў у сельскай гаспадарцы, а ў апошнія гады – на Бераставіцкай мытні.

Язэп ПАЛУБЯТКА

І Ў "ЛЕНІНЦЫ" ПРАЙШЛІ КАДРАВЫЯ ЗМЕНЫ

У калгасе "Ленінец" прыступіў да працы новы намеснік старшыні калгаса.

Да гэтага часу Валерый Гулевіч працаваў у суседнім калгасе "Шчара". Замяніў ён Пятра Акулку, які пакінуў гаспадарку пасля таго, як яго не зацвердзілі старшынёй.

Антон МАКЕЙ

У БАНКУ ЗМЯНІЎСЯ КІРАЎНІК

Іван Кандратовіч прыняў справы ўпраўляючага Мастоўскага аддзялення "Беларусбанка".

У свой час ён навучаўся ў былога старшыні Нацбанка РБ прафесара Станіслава Багданкевіча, да гэтага ўзначальваў мясцовае аддзяленне "Прыорбанка". Іван Кандратовіч замяніў на пасадзе Ірыну Сераброўскую, якая болей як дзесяць год назад з пасады камсамольскага работніка перайшла працаваць на пасаду загадчыцы Мастоўскага аддзялення "Ашчаднай касы".

Антон МАКЕЙ

УЛАДЫ СПРАБУЮЦЬ ЗВОЛЬНІЦЬ ФЕЛЬШАРКУ

На апошняй сесіі Курылавіцкага сельсавета разглядалася праца Задворскага ФАПа.

Гэта медыцынская ўстанова абслугоўвае сем населеных пунктаў, дзе пражывае187 чалавек. Сярод іх маюцца немаўляты, дзеці школьнага ўзросту, а таксама інваліды і ўдзельнікі вайны. За 5 месяцаў бягучага года загадчыца ФАПа Г. Дубіцкая прыняла 210 хворых. Жанчына ўжо тры гады як на пенсіі, але год назад, дзеля паскарэння абслугоўвання хворых, ёй далі веласіпед. Самому памяшканню ФАПа патрэбны рамонт, працякае дах. Сесія Курылавіцкага сельсавета сваім рашэннем рэкамендавала замяніць загадчыцу гэтай сельскай медыцынскай установы, чым паставіла кіраўніцтва раённага ТМА у тупіковы стан, бо на сённяшні дзень на вёсцы не хапае медыцынскіх работнікаў.

Антон МАКЕЙ

ПАПАРЫЛІ

Адна маладая сям'я з Мастоў вырашыла парацыць у лазні месячнае немаўля.

У выніку дзіцё атрымала апёкі і было змешчана ў лякарню.

Антон МАКЕЙ

АДНАЎЛЯЮЦЬ СПАДЧЫНУ

На працягу тыдня ў вёсцы Шчэчыцы Луненскага сельсавета працавала археалагічная экспедыцыя Гродзенскага універсітэта.

Спецыялісты праводзілі раскопкі ля муроў уніяцкай царквы. Ад гэтай пабудовы засталіся зараз толькі сцены. У свой час тут актыўна праводзілі раскопкі мясцовыя дзеці, якія сцвярджаюць, што там пахаваны нябожчыкі.

Язэп ПАЛУБЯТКА

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

ООН

ПЛОХИЕ ПОКАЗАТЕЛИ

Однажды к вам в двери постучатся какие-то люди, представившись работниками газовой компании, и предложат свои услуги. В случае, если газопровод пролегает не очень далеко от вашего дома, то за подключение они попросят стандартную цену – 100-150 долларов, ну, а если же такового поблизости нет, то и это не беда... Вам в доверительной форме расскажут, что как раз возле вашего участка, хотя и не отмечена в официальных документах, проходит промышленная газовая труба, и исключительно в индивидуальном порядке, в нее можно "врезаться", естественно, за двойную, а то и тройную оплату.

О! Горе тем, кто попадется на эту "удочку"! Действительно, в очень короткие сроки несколько рабочих займутся этим нелегким трудом, причем они могут использовать наемную спецтехнику. Будет вырыта траншея, к вашему дому подведут трубу и, якобы после улаживания необходимых формальностей, пустят газ. Крайне довольные таким скорым и простым решением этого вопроса, вы платите оговоренную сумму и радуетесь жизни...

Единственное "но": мошенники и не думали подключать вас к какому-либо газопроводу! Просто-напросто где-нибудь недалеко от вашего дома они закопают в землю обычный газовый баллон, к которому и присоединят трубу. И радоваться этому благу цивилизации вы будете ровно столько, насколько хватит в баллоне газа!

Соль еще и в том, что к одному баллону мошенники могут подключить сразу несколько домов, хозяева которых пожелают приобщиться к газовой коммуникации.

Сергей ЕВМЕНОВ

ВНИМАНИЕ!

В ночь с 25 на 26 июля 2002 года на автодороге д. Павлово — д.Акачи в районе д. Павлово Слонимского района неизвестное лицо, двигаясь на неустановленной автомашине, совершило наезд на гр-ку Еремейчик Ю.Н. и с места происшествия скрылось. В результате Еремейчик Ю.Н. с тяжёлыми повреждениями была помещена в реанимационное отделение Слонимского ТМО.

Убедительная просьба всем, кто явился очевидцем данного происшествия или кому стало что-либо известно о происшедшем, обращаться в Слонимский РОВД по телефонам: 02, 2-44-02, 2-46-02, 2-18-02, 2-10-37.

Анонимность и вознаграждение гарантируем.

СТАТЫСТЫКА

НЕСУЦЯШАЛЬНЫ РОСТ ЗАПАЗЫЧАНАСЦІ ПА ЗАРПЛАЦЕ

За паўтара месяцы запазычанасць па зарплаце на прадпрыемствах прамысловасці і сельскай гаспадаркі Слонімскага раёна вырасла на 11,7 % (на 52 837 тысяч рублёў) і склала 501 мільён 200 тысяч рублёў.

За гэты ж перыяд прамысловыя прадпрыемствы здолелі знізіць запазычанасць з 39,5 мільёнаў рублёў да 32 мільёнаў. А вось у сельскай гаспадарцы раёна сітуацыя несуцяшальная. Запазычанасць сельгаспрадпрыемстваў па зарплаце ўзрасла да 496 мільёнаў 200 тысяч рублёў. Гэта на 14,7 % больш, чым было па стану на 31 траўня (408 мільёнаў 863 тысячы рублёў).

Валерый КАВАЛЕНКА

НАВІНЫ

ВЫСТАВА З ГДАНЬСКА

Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей прымае выставу з фондаў Гданьскага музея.

З польскімі калегамі гродзенцы супрацоўнічаюць ужо не першы год. У Гданьск адпраўлялі раней выставы, прысвечаныя гістарычнаму мінуламу горада над Нёманам. Цяпер прыйшоў час жыхарам Гродна пабачыць цікавую экспазіцыю з Гданьска, у якой старадаўнія гравюры, створаныя славутымі мастакамі мінулага.

Міхась ВАСІЛЕВІЧ

ВОЕННОЕ ИМУЩЕСТВО НА МИРНЫЕ ЦЕЛИ

Днями белорусское правительство утвердило Положение о порядке отчуждения объектов инфраструктуры военных городков, высвобождаемых при реформировании Вооруженных сил Беларуси.

Согласно этому документу, объекты военных городков могут быть безвозмездно переданы в коммунальную собственность административно-территориальных единиц Беларуси, в ведение республиканским унитарным предприятиям и юридическим лицам, а также в собственность иным юридическим и физическим лицам. Кроме того, объекты могут быть проданы юридическим и физическим лицам.

Для решения вопросов отчуждения объектов инфраструктуры высвобождаемых городков Министерством обороны совместно с облисполкомами должны быть созданы областные рабочие группы. Они должны в двухмесячный срок рассматривать предложения заинтересованных юридических и физических лиц по дальнейшему использованию высвобождаемых объектов с учетом возможностей размещения на их базе: производств, "способствующих стабилизации экономики республики", оздоровительно-лечебных и культурно-просветительных учреждений, производств по выпуску и переработке сельхозпродукции и других "экономически эффективных и социально-значимых объектов".

Правительство также утвердило перечень объектов военных городков, которые безвозмездно передаются в коммунальную собственность городов Минска, Бреста, Слонима и Новополоцка, Брестской и Витебской областей, Лидского и Поставского районов.

В Слониме таким объектом — единственным — является здание бывшей военной комендатуры, ныне расформированной. Находится оно в Водопроводном переулке. Но, как отметил командир 11 механизированной бригады полковник Николай Скобелев, здание это не будет передано в коммунальную собственность города. Предполагается продать его.

Это не противоречит постановлению правительства, которое предполагает, решая вопросы дальнейшего использования объектов высвобождаемых военных городков, в первую очередь рассматривать возможность их продажи с зачислением вырученных средств на счет Минобороны.

Наталья КУЛАГИНА, Валерий КОВАЛЕНКО

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

КНІГАРНЯ

РАДЫ ЗА СВАЙГО ЗЕМЛЯКА

Не так даўно гродзенскае грамадскае аб'яднанне "Ратуша" выпусціла ў свет кнігу майго земляка Аляксандра Талерчыка, які, як і я, нарадзіўся ў вёсцы Парэчча Слонімскага раёна. Свой твор ён назваў так: "Парэчча. Гісторыка-краязнаўчы нарыс пра вёску Парэчча Слонімскага раёна".

Кніга, прысвечаная адной вёсці!.. Падобнае выданне не часта ўбачыш у краінах свету, няхай яны і маюць багатыя культурныя і эканамічныя традыцыі.


Не адзін дзесятак гадоў Аляксандр Сямёнавіч Талерчык збіраў матэрыялы для кнігі, рупліва пісаў радок за радком, узгадваючы свіх землякоў.

На мой погляд, "Парэчча" – гэта і навуковая праца, і гісторыка-краязнаўчы нарыс, і ўспамін, і роздум аўтара, і лірычная споведзь, бо ў кожным слове, напісаным пра вёску і яе людзей, адчуваецца цеплыня, замілаванне, перажыванне і боль.

Кніга складаецца з асобных раздзелаў, размешчаных у храналагічным парадку. Першы з іх – "З глыбіні вякоў" – паведамляе пра гісторыю ўзнікнення маёй вёскі.

Каб пацвердзіць сваю думку, Аляксандр Талерчык прыводзіць разнастайныя дакументы, узятыя з архіваў. 7 лістапада 1556 года – першае архіўнае ўпамінанне аб Парэччы, значыць, і дата яго нараджэння.

Чытаю раздзелы "Валовічы", "Паўстанне 1831 года і ўдзел у ім Міхала Валовіча", "Міхаіл Мураўёў супраць Міхала Валовіча" і, бы жывога, бачу перад сабою мужнага ваяра з маёнтка Парэчча Міхала Валовіча, якога за заслугі перад Айчынай можна паставіць поруч з такімі беларускімі героямі, як Кастусь Каліноўскі і Тадэвуш Касцюшка. Калісьці, пры паляках, штогод ушаноўвалася памяць Валовіча-ротмістра (капітана) літоўскай кавалерыі, якому падчас паўстання 1830-1831 гадоў прыйшлося паваяваць і ў польскіх атрадах супраць расійскіх жаўнераў. Палякі ўшаноўвалі памяць , а нашым уладам народныя героі не патрэбны. Нашы ўшаноўваюць, напрыклад, Суворава, які дапамагаў цару заваёўваць Беларусь. Дзіўна, што да гэтага часу нашы ўлады не ўшанавалі памяць актыўнага дзекабрыста (у час допытаў у Петрапаўлаўскай крэпасці ён здаў сваіх сяброў, у тым ліку і брата Аляксандра, сасланага ў Сібір), затым крывавага дыктатара Беларусі Міхаіла Мураўёва, які 21 ліпеня (2 жніўня па новаму стылю) ў Гродне за Скідзельскаю "заставаю" павесіў майго земляка, слыннага сына Беларусі Міхала Валовіча, а праз трыццаць гадоў ужо ў Вільні такім жа чынам расправіўся з Кастусём Каліноўскім, якому, як і Валовічу, было толькі 26 гадоў. Прыйдзе час – і народ успомніць сваіх сапраўдных герояў, ушануе іх. Аляксандр Талерчык, наш добры маг, вярнуў жа з небыцця светлае для беларусаў імя Міхала Валовіча.



Цікава чытаюцца раздзелы "Паншчына", "Парэцкая дача". На адной з іх старонак змешчаны нават інвентарны вопіс сялян, якія жылі ў Парэччы ў1832 годзе. Тут знаходжу і свайго даўняга прашчура. З кнігі "Парэчча" можна даведацца, што Слонімшчына з Жыровіцкім манастыром была цэнтрам уніяцтва ў Беларусі. Дазвольце прывесці невялікую вытрымку з кнігі: "Менавіта тут у 1726 г. Пастановай папскага капітула былі ўскладзены на галовы Багадзіцы Ісуса і Багародзіцы Дзевы залатыя кароны. Каранаваны абраз Божай Маці Жыровіцкай стаў галоўнай уніяцкай святыняй".

Што выходзіць? Знішчылі нашу рэлігію, нашых герояў, адабралі святыні, а не каюцца ў здзейсненым, нават не хочуць прызнавацца. Сімвалічна, што на вокладцы гэтай унікальнай кнігі змешчаны фотаздымак знішчанай Саветамі каменнай Парэцкай царквы. Яна і разбураны савецкімі гаспадарнікамі дом у цэнтры Слоніма, які па задумцы павінен быў стаць тэатрам, – на мой погляд, яскравыя сімвалы абрусення, заняпаду і бязбожніцтва на слонімскай зямлі.

Аляксандр Талерчык падрабязна расказвае, як у 1865 годзе малады святар Аляксандр Гарачка на маляўнічым узгорку, каля сядзібы Валовічаў, паміж Парэччам і Барташамі, разам з прыхажанамі стаў будаваць царкву. У жніўні 1867 года, на Успенне, адкрылася яна. А што сёння бачым мы? Зноў невялікая цытата з кнігі: "Царква спалена. Склеп разбураны. Літыя крыжы з царквы, помнік і агароджа магілы Гарачкі здадзены вучнямі мясцовай школы на металалом".

Краязнаўцы, аматары гісторыі і літаратуры даведаюцца з кнігі, што ў Парэччы некалі працавалі вядомыя ў Беларусі людзі: святар Хвядар Данілюк і настаўнік Васіль Кісель. А яшчэ прачытаюць аб тым, як жыла вёска падчас дзвюх апошніх сусветных войнаў, чым была адметна ў пасляваенны час.

Гісторыя вёскі Парэчча – гэта гісторыя нашай Беларусі, нашых продкаў, нашых людзей. Я рады, што Аляксандр Сямёнавіч Талерчык напісаў такую кнігу. Ганаруся ім.

Аляксей ЯКІМОВІЧ, член Саюза беларускіх пісьменнікаў

ПРЫРОДА

АВЯЛЬГА – ПТУШКА 2002 ГОДА


У апошнія гады на Беларусі, як і ў многіх іншых краінах свету, вучонымі-арнітолагамі і аматарамі прыроды традыцыйна праводзіцца акцыя "Птушка года".

На гэты раз яна прысвечана авяльзе. Памятаеце ясенінскія радкі:

Плачет где-то иволга,
схоронясь в дупло.
Только мне не плачется –
на душе светло?...

Перш чым выправіць экалагічную памылку (так-так!) у вершы рускага класіка, давайце паспрабуем разабрацца, што ўяўляе сабой авяльга (па-руску – иволга) на самай справе.

Гэта цудоўная, добра ўсім вядомая і адначасова таямнічая і поўная загадак залатая птушка – адзіны прадстаўнік трапічнага сямейства авяльгавых, які атрымаў прапіску ў нас, на Беларусі. Авяльга ўяўляе сабой яскравы прыклад таго, што можа зрабіць вялікі майстра – Прырода, карыстаючыся ўсяго двума кантрастнымі колерамі: жоўтым і чорным. Менавіта так афарбаваны самец авяльгі: жоўтае цела, чорныя крылы і хвост, чорная палоска праз вока... Гэта кантраст і адначасова гарманічнае спалучэнне колераў надае птушцы такі непаўторны выгляд, што ёй можна смела прысвоіць амаль што каралеўскі тытул: птушка, якую ні з кім ніколі не пераблытаеш. Яно і сапраўды так. Дастаткова толькі аднойчы ўбачыць гэтую цуда-птушку, каб запомніць яе на ўсё жыццё. Вось толькі бачыць яе, нягледзячы на такую экзатычнасць афарбоўкі, даводзіцца не часта – авяльга вельмі асцярожная, баязлівая птушка, якая большую частку свайго жыцця праводзіць высока ў кронах дрэў.


Авяльга

А цяпер самы час успомніць пра авяльгу, якая "плачет, схоронясь в дупло". Трэба адзначыць, што, па-першае, гняздуецца авяльга зусім не ў дуплах. І, па-другое, жытло яе сапраўды незвычайнае. Гняздо – зграбны кошычак з размачаленых драўляных валокнаў, мінулагодніх сцяблін і лісця злакаў – звычайна падвешваецца да развілкі тонкіх бакавых галін дрэва.

Быццам стараючыся ў поўнай меры выкарыстаць перавагі жыцця ў верхнім ярусе лесу, птушка прымайстроўвае сваё жытло высока ў кроне. Размешчанае такім чынам гняздо, па-першае, амаль немагчыма заўважыць з зямлі, а па-другое, нават самы настойлівы драпежнік да яек альбо птушанят, падвешаных нібыта ў люльцы паміж небам і зямлёй, не дабярэцца.

Усё сказанае вышэй уяўляе сабой далёка не поўны пералік цудоўных і загадкавых уласцівасцяў авяльгі, і, назіраючы за гэтай цудоўнай птушкай, кожны з аматараў прыроды зможа адкрыць для сябе шмат новага і цікавага, а таксама падзяліцца вынікамі сваіх назіранняў.

У рамках кампаніі "Авяльга – птушка 2002 года" афіцыйны прадстаўнік BirdLifo International у Беларусі, грамадская арганізацыя "Ахова птушак Беларусі" прапануе ўсім жадаючым прыняць удзел у наступных конкурсах: "Авяльга ў Беларусі", "Лепшы фотаздымак авяльгі", "Дзіцячы малюнак авяльгі", "Казка на тэму "А чаму ў авяльгі?..". Падрабязней аб умовах конкурсаў можна даведацца ў сакратарыяце АПБ (зялены тэлефон 8-017-2630-613). Цікавых вам назіранняў і поспехаў у даследаваннях!

Святлана ПРАКОФ'ЕВА, сябра АПБ (па матэрыялах інфармацыйнага бюлетэня "Ахова птушак Беларусі")

ДЭБЮТ

Александр СПОР

О себе. Родился давно. Пишу тоже давно. По образованию – инженер.

ТОЛЬКО МНЕ НЕЛЬЗЯ БОЛТАТЬ ОБ ЭТОМ...

* * *

Весна - хорошая пора,
Деревья расцветают
Весной в озоне есть дыра.
В ней НЛО летают.

Весной учиться лучше, чем
Зимой или в Китае.
Влетает в ухо "Мир и Чел",
В другое вылетает...

Весной, как Боинг, шмель летит,
Девчонка тихо плачет,
Весной девчонке не решить
По физике задачи.

* * *

Говорить о любви бесполезно,
Что сказал – наутро забуду.
Для лечения этой "болезни"
Надо просто довериться чуду.

Посчитать бухгалтерию чувства
Никому никогда не удастся.
Ремесло это или искусство –
Надо прежде всего отдаться...

А потом, если хватит силы,
На расчеты и на беседы,
Разговаривай, друг мой милый,
Или все передай соседу.

2000 г.

* * *

Если есть День рождения –
Пей!
Если есть Чё –
Друзьям налей!
Если есть никотин –
Дыши!
Про врагов не забудь –
Души!
Пусть сегодня ты в полном
Г-не!
Жизнь "ишо" не кончается,
Не-е-е!
Если "щас" не утонешь в
Вине.
Завтра будешь на белом
КОНЕ!

НИЗЗЯ-А-А!

Работаю сотрудником чека.
Работа, сами знаете, сурьёзная.
Но чтой-то стала дёргаться щека.
Работа, сами знаете, нервозная.

Вчерась мы выезжали на дежу..,
Дежурство боевое с пистолетом.
И я теперь простреленный лежу,
Низя мне только говорить об этом.

Спустило, значить, видно, колесо,
И «бобик» оказался за кюветом,
А шофер наш – по прозвищу Насос,
Но только мне низя болтать об этом.

Я стройный в портупее кипарис,
Тяжелая работа меня сушит.
Иди, за демократию борись,
Не забывая про глаза и уши.

А напоследок я хочу сказать
На пару с Шурой Пушкиным, с поэтом,
Что есть необходимость завязать,
Но только мне нельзя болтать об этом.

* * *

Солнышко проснулось,
Неба синева;
Может быть взгрустнулось,
Есть еще слова.

Может веселее и богаче жить
Стало, или денег надо одолжить?!
Вечная природа, вечные слова,
Вечная как вечность неба синева.

И не надо песен
О богатстве петь,
Нам бы только Солнышко
Посмотреть успеть.

Солнышко проснулось,
Зелена трава.
Пусть всегда синеет
Неба синева.

ПРОЗА

ПЕДАГАГІЧНАЯ ПРЫТЧА НАНАЧ

Дзед Віці колісь, раздзёршы рот, памёр ад зяхоткі; сам Віця цяпер паміраў ад кахання.

Папярэджвалі яго дактары (што жылі па-суседству) пра хранічнае захворванне слаўнага продка, але Віця не слухаўся, вось напасць тая і мутыравала ў новую якасць.

Бывала, прыйдзе Віця з самага ранку, сядзе да Светкі з чацвёртай парты – і ўсё пазяхае: слова гэтак ад кахання да настаўніц прамовіць не можа.

– Ты б хоць рот перахрышчваў, – параіла Светка. – А то праваліўся ў апраметную на выпускных.

Таго Віця і сам баяўся. Ірыне Сямёнаўне па літаратуры замест сачынення кветку намаляваў. Прыгожую. Хіміцы Ідзе Ісаакаўне ад бацькі канверт перадаў. З "зялёнымі".

І так замучыла яго ягоная любоў, што выпетраў Віця ўшчэнт. Як ні суцяшалі, як ні ратавалі яго лекары-суседзі, бацька, Светка перад самымі іспытамі, Віця памёр. Памёр назаўсёды...

Для нядрэмнай ідэйнай грамадскасці.

Аляксандр НІКАТЫНЕН-БОЦЕЎ

ПАЭЗІЯ

ЗЯМЛЯ

Няма дажду слёз арашальных.
Зямля сасмягла. Не растуць
Ні агуркі на градах дальніх,
Ні памідоры ў рост не йдуць.

Нашу ваду. Цягаю вёдры
І думаю, што вось жа каб
Не ўцёк адсюль,
то быў бы шчодрым
Гаспадаром. І ён жа раб

Зямлі і хціваe сістэмы,
Што сокі п'е з зямлі, з людзей.
Ні страшны ёй
ні звонку змены,
Ні ход грамадскіх там падзей.

Даўно не любяць селяніна,
Пры тым, што дояць,
жылы рвуць.
А ён працуе як скаціна
За чэрствы хлеб,
што прывязуць.

Свая зямля ўжо не патрэбна,
А аўтар "Новае зямлі",
Калі б устаў,
памёр бы, пэўна,
Зноў ад таго, што адвялі

Гаспадара ад гаспадарства,
Раскамуніздзілі калгас,
Што нават і
начальства-панства
Здрабнела, як рубель у нас.

Не, думаю, спі,
дзядзька Колас,
Бо тваe "Новае зямлі"
Да мужыка
не дойдзе голас,
Паэты ж з вёскі уцяклі.

Вяртанне ў госці,
ў адпачынак –
Як тут шчырую зараз я, –
То для мастацтва не прычына,
Ды вабіць, цягне нас зямля.

ТУТ

Вецер шуміць, гудзе,
Лета на скон ідзе.
Гэта адчуў я дзе? –
Тут, на сваёй градзе.
Тут я сяджу, ляжу,
Чытаю ці, вось, пішу.
Многа ўсяго ёсць тут.
Хацеў бы, каб і... капут.

Юрка КАРПАЧ

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

ФУТБОЛ. ПЕРШАЯ ЛІГА

РАЗЛІЧЫЛІСЯ ЗА ПАРАЖЭННЕ Ў ПЕРШЫМ КРУЗЕ

"Камунальнік" (Слонім) — "Нафтан" (Наваполацк), 1 - 0

Слонім. 27 ліпеня (субота). Стадыён "Дынама". 1 200 гледачоў.

Суддзя: Г. Звярок (Мінск).

"Камунальнік": Курыловіч, Вольскі (К), Майсейчык, Горбач, Плют, Скляр (Зюлеў), Асіпенка, Астапчык, Ясеенка (Місюк), Аначэнка, Цыганенка.

Гол: Майсейчык, 85.

З добрым настроем выйшлі на гульню з адным з лідэраў чэмпіянату ігракі "Камунальніка". Відавочна было жаданне разлічыцца дома за крыўднае паражэнне ў стартавым матчы чэмпіянату. І як паказала гульня, слонімцам ўдалося гэта зрабіць. Ды плюс да таго яшчэ прадэманстраваць якасны футбол.

Пачатак сустрэчы застаўся за гаспадарамі поля. А балельшчыкі ўбачылі каманду з новай расстаноўкай ігракоў.

На пазіцыі апошняга абаронцы Аляксандра Вольскага замяніў Павел Плют. Вольскі ж пайшоў у атаку, дзе нядрэнна праявіў сябе. Ужо на першых хвілінах гульні Аляксандр меў магчымасць адкрыць лік у матчы. Не скарыстаў добры момант Сяргей Скляр, які ўпершыню выйшаў у стартавым складзе "Камунальніка".

Гульня, увогуле, атрымалася прыгожай. Роўныя па сілах сапернікі мелі шмат магчымасцей забіць гол.

Двойчы штанга і перакладзіна выратоўвалі "Камунальнік", а ў другім тайме Вольскі з пяці метраў "стрэліў" прама ў варатара гасцей.

Вынік сустрэчы вырашыў адзіны гол. За 5 хвілін да заканчэння гульні навес з вуглавога бездакорным ударам галавой замкнуў Валерый Майсейчык, які своечасова падключыўся да атакі. Радасці футбалістаў і балельшчыкаў не было канца. У раздзявалку ўдзячныя гледачы праважалі сваіх любімцаў апладысментамі.

Ігракі "Камунальніка" здолелі паказаць у гульні з "Нафтанам" свае лепшыя здольнасці і далі сапраўдны бой моцнай наваполацкай камандзе.


Пераможны мяч улятае ў вароты разгубленых футбалістаў "Нафтана"

Фота Вольгі ШЫНКЕВІЧ

Турнірная табліца пасля 16-га тура

		гульні	В	Н	П	ачкі	мячы
1.	Дарыда	16	13	3	0	42	49-13
2.	Ведрыч-97	16	11	1	4	34	33-14
3.	Лакаматыў	16	10	4	2	34	30-8
4.	Нафтан	16	9	5	2	32	32-14
5.	Граніт	16	9	3	4	30	22-14
6.	ЗЛіН	16	8	1	7	25	23-21
7.	Камунальнік	16	7	3	6	24	17-25
8.	Ліда	16	6	3	7	21	26-28
9.	Дынама-Юні	16	6	1	9	19	23-25
10.	Нёман	16	6	1	9	19	24-32
11.	Днепр-ДЮСШ-1	16	4	6	6	19	18-21
12.	Тарпеда-Кадзіна	16	4	4	8	16	21-28
13.	Хімік	16	4	3	9	15	17-27
14.	Смаргонь	16	4	2	10	14	8-18
15.	Бяроза	16	4	1	11	13	25-38
16.	Асіповічы	16	1	3	12	6	10-52

Застаецца толькі спадзявацца, што ў наступным матчы, 3 жніўня, слонімцы згуляюць не горш. А прыйдзецца сустракацца на выездзе з лідэрам чэмпіянату Беларусі ў першай лізе — "Дарыдай".

Дарэчы, калі меркаваць па турнірным становішчы, дык у "Камунальніка" добрыя перспектывы, каб, як мінімум, увайсці ў першую пяцёрку на заканчэнні сезону.

Хаця нічыя ў 15-м туры з "Лакаматывам", выйгрыш у апошнім туры ў "Нафтана"— а гэта каманды з лідзіруючай групы — даюць надзею і на шмат большае.

Валерый КАВАЛЕНКА

Вынікі астатніх матчаў 16-га тура:

Смаргонь – Ведрыч-97,	0-2
Днепр-ДЮСШ-1 – ЗЛіН,	3-2
Ліда – Бяроза,	2-5
Граніт – Асіповічы,	5-0
Нёман – Тарпеда-Кадзіна,	3-0
Дынама-Юні – Хімік,	1-0
Дарыда – Лакаматыў,	2-2

ФУТБОЛ. ПЕРШАЯ ЛІГА

МАСТАЎЧАНЕ ЗДАБЫЛІ ЯШЧЭ АДНУ ПЕРАМОГУ

У 16-м туры мастоўскі "Нёман" прымаў на сваім полі "Тарпеда-Кадзіна". Стартавы склад мастаўчан выглядаў так: Шыдук, Атакішыеў, Рудзько, Коцка (К), Дудзін, Патоцкі, Алег Вярбіцкі, Ушкевіч, Казміровіч, Белаш, Грынюк.

Матч пачаўся з пяціхвілінный затрымкай, бо госці затрымаліся ў дарозе. А гаспадары не далі тарпедаўцам асвоіцца на полі, і не паспеў яшчэ дыктар аб'явіць склады каманд, як Руслан Белаш прымусіў гасцей дастаць мяч з сеткі сваіх варотаў.

Пасля перапынку ў чэмпіянаце малюнак гульні мастаўчан змяніўся, і гэта адразу кінулася ў вочы. У атацы пастаянна знаходзіліся Белаш і Вярбіцкі, а чатыры абаронцы амаль не пакідалі сваёй паловы поля. І гэта прынесла свой плён.

Папераменна, то Белаш, то Вярбіцкі спарбавалі разарваць абарону гасцей. А падчас адной з атак Белаш выходзіць сам на сам з варатаром тарпедаўцаў, але нападаючага "Нёмана" збіваюць у межах варатарскай пляцоўкі — пенальці. Пасяхова выконвае яго сам пацярпелы, 2:0. Да перапынку Белаш і Вярбіцкі мелі яшчэ некалькі выгодных момантаў, каб павялічыць лік у матчы, але мяч у вароты гасцей не ішоў.

У другой палове гульні на замену Казміровіча і Коцка выйшлі Дзенісевіч і Крупіца. Сцэнарый сустрэчы гэта не змяніла. Раз-пораз турбавалі варатара "Тарпеда" Белаш і Вярбіцкі. І на 60-й хвіліне Алег забівае свой 11-ты гол у чэмпіянаце. Лік 3:0 на карысць мастаўчан захаваўся да канца матчу, нягледзячы на тое, што ў апошнія трыццаць хвілін каманды абмяняліся некалькімі вострымі атакамі.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ГЕРОЙ ДНЯ

ВАЛЕРИЙ МАЙСЕЙЧИК: КАК ГОЛ ЗАБИЛ,— СРАЗУ И НЕ ПОНЯЛ

Единственный, но такой важный для слонимской команды гол в игре против "Нафтана" забил новобранец "Коммунальника" Валерий Майсейчик. Сразу же после матча корреспонденту "ГС" удалось взять у Валерия мини-интервью.

— Валерий, это твой первый гол в чемпионате за "Коммунальник". Как ощущения?

— Если честно, то пока еще полностью не осознал. Игра трудная очень была. Гол забил, сразу даже не понял. Не видел, как мяч в ворота влетел.

Но радости было много. Все ребята поздравляли, это было приятно. Тем более, что гол был победным.

— В этом матче несколько футболистов играли на новых игровых позициях. Не сложно было перестроиться?

— Просто пару игроков перед этой игрой выбыло. Саша Фиранчук получил травму, Ваня Срибненко уехал.

Поэтому и пошли перестановки.


Фота Вольгі ШЫНКЕВІЧ

Герой матча Валерий Майсейчик

Саша Вольский в центре сыграл, я за ним, вроде неплохо получилось. А за спиной, в обороне, чувствовал, что все спокойно.

— Что ж, удачи. Желаю и дальше так же играть.

Валерий КОВАЛЕНКО

КРУПНЫМ ПЛАНОМ

В ЗАПАСЕ ПЕРЕЖИВАНИЙ НЕ МЕНЬШЕ, ЧЕМ НА ПОЛЕ

В этом году состав слонимского "Коммунальника" наполовину обновился. В команду пришли молодые, перспективные игроки. Из "старожилов" же остались, пожалуй, только братья Анатолий и Валентин Дегили. В особом представлении слонимским любителям футбола они не нуждаются. И все же, сегодняшний наш разговор именно с ними.

— Вы в команде самые старшие и опытные игроки. Как по-вашему, есть какие-нибудь различия в "Коммунальнике" нынешнем и прошлых лет?

А. Д. — Раньше футболисты были постарше, сейчас пришла молодежь. Но это и нормально.

— А не обидно, что вас все больше в запасе держат?

А. Д. — Ничего. Надо уступать место молодым...


— А если вспомнить вашу футбольную молодость?

А. Д. — Есть что вспомнить. Поиграли и в высшей лиге, да и сейчас команда хорошая складывается...

— Особенно, если судить по последней игре и сравнивать с началом сезона.


Фота Вольгі ШЫНКЕВІЧ

Анатолий Дегиль


Фота Вольгі ШЫНКЕВІЧ

Валентин Дегиль

А. Д. — Да, конечно. В начале сезона у нас команда практически не сыграна была.

В. Д. — Успели только две недели вместе поработать. Едва тренироваться начали, а уже начало чемпионата...

— О команде мы еще успеем поговорить. О себе что-нибудь можете рассказать?

А. Д. — Что о нас говорить? Про нас уже все написано.

— Ну, как же все? А вот вы все еще холостяки?

А. Д. — Да, хотя пора уже жениться. Вот с футболом закончим, тогда...

— Только после того, как с футболом закончите?

А. Д. — Шутим, конечно же. Надо, надо жениться.

В. Д. — После сезона, может быть.

— Но личное же, свободное время есть? Чем занимаетесь?

А. Д. — Всем понемногу. Телевизор, газеты... И с друзьями время проводим.

В. Д. — Сейчас, правда, две недели серьезный тренировочный процесс шел, так что особенно никуда и не вырваться было. И подготовка ко второму кругу свои плоды дает. Вот, "Нафтан" обыграли.

— Следующая игра с лидером, "Даридой"...

А. Д. — Тяжеловато будет, но будем стараться.

В. Д. — Они ведь лидеры. Ни одного поражения за сезон не было.

— А разница есть, где играть, на своем поле или в гостях? Сказывается отсутствие слонимских болельщиков?

А. Д. — Конечно же. Правда, в этом сезоне у нас на выезде играть получается лучше.

— И с чем это связано?

А. Д. — Игра пошла. Да еще, может быть, оттого, что команда обновилась.

— А с прежними товарищами по команде связи поддерживаете?

А. Д. — Само собой. Вот и Коля Дым постоянно приезжает, Леша Баль...

В. Д. — ... Олег Вербицкий сейчас в Мостах. Был как-то раз даже на тренировке у нас. Жора Татарашвили в Альбертине живет, часто видимся.

— Давайте вспомним, с чего вы начинали свою жизнь в футболе?

А. Д. — Лет по 10-11 нам было, когда стали заниматься в Дятловской ДЮСШ. Первый тренер Афанасенков Василий Алексеевич. А когда учились в Минске в БТИ, нас заметили и пригласили в Слоним в 1992 году. Тогда команда называлась "Альбертин".

В. Д. — Прошли с ней вторую, первую, высшую лиги. Теперь вот снова в первой.

— Не жаль, что в сегодняшнем матче с "Нафтаном" вы не вышли на поле?

А. Д. — Есть немножко. Но рады за ребят. А в запасе переживаний, может, больше, чем на поле.

Валерий КОВАЛЕНКО


© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

Газета Слонімская
1 — 7 жніўня 2002г. №31 (269)

карта погоды

на 31 июля от www.meteo.by



ПРОГНОЗ ПОГОДЫ

по Гродненской области

31 июля:

переменная облачность, местами кратковременный дождь, гроза. Ветер восточный 4 – 9 м/с, при грозах порывы 15 – 20 м/с.

Температура воздуха ночью +17+22, днём +30 +33, местами до +35.

1-2 августа:

переменная облачность, днём в отдельных районах кратковременные дожди, грозы, ночью преимущественно без осадков.

Ветер восточный 4 – 9, при грозах местами порывы 15 – 20 м/с.

Температура воздуха ночью +17+22, днём +30 +34.

Информацию предоставил Гроднооблгидрометеоцентр

АНЕКДОТЫ

☺☺☹

Один хохол сдал немцам партизанский отряд. Сидит, наворачивает борщ с салом (плата за службу), мимо ведут отряд на расстрел. Один из пленных плюет в сторону предателя и грязно матерится. Тот недоуменно смотрит и спрашивает "МИКОЛА, ТЫ ЧЕ, ОБИДЕЛСЯ, ШТО ЛИ"?

☺☺☹

Альпинисты совершают горный переход. Вдруг один альпинист срывается и падает в ущелье. Его товарищи подбегают к ущелью и кричат:

- Сеня, руки, ноги целы?

- Целы..., - раздается слабый ответ.

- Так вылезай!

- Не могу. Я еще падаю...

☺☺☹

Студент приходит на почту и пытается за 5 копеек отправить телеграмму родственникам: "Вышлите 75 рублей". Телеграфистка ему говорит:

- С вас 15 копеек, по 5 копеек за слово.

Тогда студент переправляет текст: "Семидесятипятирублируйте".

☺☺☹

Как начинается радиовещание в разных городах:

- Внимание! Говорит Москва.

- Увага! Говорыт Кыйив.

- Ахтунг! Хир шприхт Берлин.

- Ша! Одесса имеет сказать пару слов.

☺☺☹

Дама хочет снять номер в провинциальной гостинице на трое суток.

- А когда у вас подают еду?

- Завтрак с семи до одиннадцати, ланч с полудня до трех часов и обед с семи часов до девяти вечера.

- О боже! У меня остается так мало времени на осмотр города!

☺☺☹

- Вы укротитель львов?

- Совершенно верно.

- Почему же они вас не трогают? Вы такой маленький, худенький...

- В том и весь фокус. Они ждут, когда я потолстею.

☺☺☹

Сын жалуется отцу:

- Папа, а наша бабушка ругалась сегодня страшными словами.

- Как?

- Она сказал: "А чтоб этот несчастный телевизор сломался сегодня перед самым хоккеем!"


☺☺☹

Самогон - ваш враг. Гоните его!!!

Кроссворд от Владимира Вашуты

двухбуквенный

В каждую клетку вписывается не одна, а две буквы.



ПО ГОРИЗОНТАЛИ

1. Выдающийся французский философ, физик и математик XVII века.
4. Массы снега, низвергающиеся с гор.
6. Ряд арок, опирающихся на столбы или колонны.
8. Всеядное животное.
9. Словесный текст музыкально-вокального произведения.
11. Герой оперы П.И.Чайковского «Черевички».
14. Спутник планеты Сатурн.
18. Древнескандинавское народное сказание.
19. Ягодный кустарник.
22. Способ самоубийства путём вспарывания живота кинжалом, принятый у самураев.
25. Большие соревнования на парусных гребных судах.
28. Длинный ряд комнат.
29. Народный писатель Беларуси, автор драмы «На рассвете».
30. Металлические латы на грудь и спину для защиты в бою.
32. Сорт конфет.
34. Вид местности, открывающийся с высоты.
37. Французский футбольный клуб.
39. Мрак.
42. Остов.
45. Плотно закрывающийся бак для горючего, смазочных масел.
46. Членистоногое животное отряда пауков.
47. Верхняя длинная одежда католического духовенства.
49. Поворот в воздухе при прыжке.
50. Большой стог сена.

ПО ВЕРТИКАЛИ

2. Пункт санитарного осмотра людей, прибывших из местности, охваченной эпидемией.
3. Ларец для хранения мощей святых.
5. Украшение в виде небольшого рисунка, орнамента в начале книги или главы.
6. Приток Куры.
7. Филистимлянка, возлюбленная Самсона (библейск.).
10. Небольшой ресторан.
12. Государство.
13. Конечность.
15. Столица государства.
16. Известный русский адвокат.
17. Химический элемент.
18. Женская одежда в Индии.
20. Отходы использованной бумаги.
21. Построение пехоты четырёхугольником.
22. Жилище.
23. Камера для киносъёмок.
24. Тропический плод.
26. Старинное военное многовёсельное судно.
27. Английская спортивная игра.
30. Продольный брус, проходящий по всей длине судна в середине его днища.
31. Траншея, применявшаяся при осаде крепостей для постепенного приближения под огнём противника к его укреплениям.
32. Родоначальник немецкой классической философии.
33. Перечень блюд.
35. Пьеса Г.Ибсена.
36. Пьеса К.Чапека.
37. Город в Лаосе.
38. Большой сад, роща.
40. Государство в Западной Африке.
41. Очень тонкая позолоченная или посеребрённая проволочка для вышивания.
42. Река в Турции.
43. Столица азиатского государства.
44. Русский писатель-сатирик XVIII века.
48. Грузоподъёмное устройство.

ГОРОСКОП НА НЕДЕЛЮ

от www.ignio.com

ОВЕН

Нынче вам просто необходима смена обстановки. Так что, ежели есть возможность, возьмите небольшой отпуск. Ну, или в командировку отпроситесь. Во всем соблюдайте меру и разумность. Особенно в еде и в развлечениях. Постарайтесь добиться признания, нынче это у вас вполне может получиться. Ибо вы, как никогда, привлекаете к себе людей собственными активностью и открытостью к общению. Нынешняя неделя - отличное время для творчества. Также вас может ждать сюрприз - судьбоносная встреча. Вопрос только - со знаком плюс или минус? Предстоит масса дел, связанных с вашей работой.

ТЕЛЕЦ

Желательно на этой неделе, не принимать серьезных решений и не совершать необдуманных поступков, ибо и то, и другое чревато серьезными последствиями. Возможно, будет изменяться ваш взгляд на определенные материальные и духовные ценности. В коллектив, где вы работаете, могут придти энергичные люди. Скорее всего, вы с ними великолепно сработаетесь и сможете совместными усилиями многого добиться. Часть планов относительно этой недели может быть нарушена непредвиденными обстоятельствами.

БЛИЗНЕЦЫ

Неделя обещает быть яркой и насыщенной различными впечатлениями и событиями, встречами и знакомствами. Благоприятное время для изменения своего имиджа. Окружающие это оценят. Ваше чувство юмора и личное обаяние могут оказать положительное влияние на ваш успех во многих делах. Наиболее легко будет преуспеть в юриспруденции, актерском мастерстве, технике. Не забывайте об отдыхе. Вам бы не помешало отправиться в небольшое морское путешествие. Вашу светлую голову на нынешней неделе будут посещать самые разнообразные идеи. И из-за этого вряд ли удастся долго усидеть на одном месте.

РАК

Хорошая неделя для повышения энергетического потенциала и укрепления собственного здоровья. Нынче вы можете раскрыть свои способности и ярко и талантливо проявить свою натуру. Удача на этой неделе будет сопутствовать вам во многом. Вы ощутите прилив сил и активности и поэтому справитесь со всякой работой, за которую возьметесь. Единственное, от чего стоит воздержаться, так это от участия в новых проектах, которые могут неожиданно появиться на вашем горизонте. Воскресенье - прекрасный день для разрушения всего ненужного и устаревшего и созидания нового.

ЛЕВ

На этой неделе вам может быть сложно решиться на стремительный скачок вперед. Победите этот малюсенький страх, и вы почувствуете удовлетворение и уверенность в собственных силах. А это будет значить, что вы, как всегда, на высоте. Энергия начнет бить ключом, вы будете способны уладить сразу тысячу дел. Вы как никогда великодушны и царственны. Накануне дня рождения, в сам день рождения , вы просто в пике формы. Фортуна улыбается вам, будьте мудры, и главное - не спешите.

ДЕВА

Возможны определенные трудности, перед которыми не стоит отступать. И тогда успех просто неизбежен. Нынче лучше опираться на проверенные методы, а нестандартные подходы использовать только как дополнение. В работе необходимо проявлять терпение и упорство, тогда преграды превратятся в пыль, которую просто унесет ветром. Ваш авторитет в коллективе нынче будет непреклонным. Не только сотрудники, но даже и руководство постарается пойти вам навстречу, создать благоприятные условия для работы.

ВЕСЫ

Неделя создания внутреннего равновесия и движения вперед. Не стесняйтесь своих способностей и возможностей, ведь один решительный и уверенный шаг позволит вам вырваться далеко вперед и почувствовать в себе мощный внутренний энергетический стержень. Будьте внимательны с окружающими, они помогут вам достичь той цели, которую вы себе наметили.Один из выходных дней посвятите уединенному отдыху, позволяющему восстановить затраченные силы.

СКОРПИОН

Вам необходимо научиться жить в мире с самим собой и окружающими. Нежелательно в порыве праведного гнева размазывать по стенке близких людей, подумайте здраво, они вам еще ох как пригодятся. Ваши энергия и напор окажут большое влияние на всех, с кем вам предстоит общаться. Стремление выделиться и достичь желаемого приведут вас к заветной цели. Середина недели хороша для решительных действий на работе. Ближе к концу недели займитесь благоустройством дома.

СТРЕЛЕЦ

Пытаясь свернуть горы на своем пути, вы можете немного не рассчитать и переоценить свои силы. Больше интересуйтесь проблемами своих коллег и подчиненных, и тогда ваши усилия не пропадут даром. Не надо винить себя в том, что изменились отношения с некоторыми коллегами по работе, ведь вашим успехам нынче можно только позавидовать, а люди так слабы. Наступает удачное время для тех, кому необходимо перейти на новую работу. Ищите - и да найдёте. Начинайте осваивать новые компьютерные программы, это может оказаться серьезным подспорьем в продвижении по карьерной лестнице. Поход за город вместе с друзьями позволит отвлечься от мелких проблем.

КОЗЕРОГ

Вам необходимо учиться принимать своевременную помощь от друзей и коллег по работе. Ведь невозможно постоянно нести на своих плечах непосильную ношу. Когда хоть немного научитесь доверять близким людям, почувствуете просто невероятную легкость. При всей широте вашей натуры и чувстве долга постарайтесь сохранить заработанные деньги для личного употребления. Устройте себе во второй половине рабочей недели выходной день. Вы его заслужили. Постарайтесь помочь детям, если, конечно, им понадобится ваша помощь.

ВОДОЛЕЙ

Не зацикливайтесь на прошлых достижениях, соберитесь с силами и решительно преодолейте новый рубеж. За затраченные усилия вы будете вознаграждены сполна. Желательно держаться подальше от всяких авантюр, связанных с легким обогащением и азартными играми. Сейчас у вас может наступить ответственный период карьерного роста и связанных с ним служебных и материальных достижений. Если не распыляться по мелочам, то можно научиться многому из того, к чему лежит ваша душа. Хорошее время для начала благоустройства вашей квартиры или дома.

РЫБЫ

Неделя связана с отдыхом, расслаблением, освобождением от суеты. Занимайтесь только необходимыми делами, а все остальное постарайтесь передвинуть на будущее. Если же от каких-то неотложных дел все же не избавиться, постарайтесь решить их в первую половину недели. Вам наконец-то удастся реализовать свои давние планы. Неотложные дела лучше решить в первую половину недели. Однако накопившаяся усталость может напомнить о себе.

Газета Слонімская
Рэг. нумар 947
ад 24.03.1997г.

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Віктар ВАЛАДАШЧУК

ЗАСНАВАЛЬНІК
Віктар ВАЛАДАШЧУК

Наш адрас:
231800, г.Слонім,
вул. Камсамольская, 8.

Тэлефоны:
рэдакцыі 2-14-39
.......................4-79-34
аддзел рэкламы 2-49-39

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні могуць не супадаць з поглядам рэдакцыі.
Рэдакцыя не вядзе перапіску з чытачамі і пакідае за сабою права рукапісы не рэцэнзаваць і не вяртаць.
Рэдакцыя таксама не адказвае за змест рэкламы.

Падпісана да друку
30 ліпеня 2002г.
Час падпісання 18:00.


Надрукавана
ў Гродзенскім абласным унітарным прадпрыемстве "Слонімская друкарня", г.Слонім, вул. Хлюпіна, 16.
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах.

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
63646 (льготная)

ЗАКАЗ № 1977

E-MAIL: gs@promedia.by HTTP://gs.promedia.by Аб'ём — чатыры друкаваныя аркушы

© «Газета Слонімская»
Спасылка на «ГС» абавязковая
Ⓚ Матэрыялы публікуюцца на правах рэкламы



© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017